# Новости

Общество

16.09.2024

## Студэнты БДУІР напісалі рэспубліканскую дыктоўку «Дзень народнага адзінства»

**16 верасня рэспубліканская дыктоўка прайшла на базе ўніверсітэтаў краіны.**

Яго тэкст чытала першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі **Алена Стэльмах**. Яна адзначыла цікавыя асаблівасці тэксту: гістарычны змест, які распавядае пра падзеі 1939 года, а таксама напамін пра Год якасці.

Алена Анатольеўна падкрэсліла складанасць дыктоўкі 2024 года, бо ў ёй прысутнічае мноства складаназалежных сказаў і дастаткова аб'ёмных па зместу слоў.

Трансляцыя дыктоўкі вялася з Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта ім. М.Танка. Напісанне рэспубліканскай дыктоўкі - вялікае свята. Дыктоўка традыцыйна праводзіцца напярэдадні Дня народнага адзінства і сімвалізуе мудрасць беларускага народа, жаданне жыць у адзінстве. Тэма гэтага года вельмі актуальная для школьнікаў і студэнтаў, таму што прысвечана патрыятызму беларускага народа і нагадвае аб любові да Радзімы.

У Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі рэспубліканскую дыктоўку напісалі студэнты ФРЭ і ФІБ. Яны падзяліліся ўражаннямі, адзначыўшы, што заўсёды з вялікай радасцю ўдзельнічаюць у патрыятычных мерапрыемствах, такім чынам выказваючы сваю адданасць Беларусі.




Стельмах Елена Анатольевна,
первый заместитель Председателя
ОО «Союз писателей Беларуси»
БГУИР
BSUIR


BSUIR




Падрыхтавана прэс-службай
Фота Ксеніі Церашковай